мантам у вылучэнні ўмоў фарміравання прафесійных каштоўнасных арыентацый будучых педагогаў-выхавальнікаў.

У заключэнне адзначым, што названыя ўмовы з'яўляюцца дастатковымі і здольны забяспечыць паспяховае фарміраванне прафесійных каштоўнасных арыентацый студэнтаў. Пацвярджэнне гэтай гіпотэзы вызначыў эксперыментальны этап нашага даследавання.

### ЛІТАРАТУРА

1. *Климов Е. А.* Индивидуальный стиль деятельности в зависимости от типологических свойств нервной системы. Казань, 1986.

2. *Петрова Н. И.* Индивидуальный стиль деятельности учителя. Казань, 1982.

3. *Буева Л. Н.* Человек: деятельность и общение. М., 1978.

4. *Бодалев А. А.* Личность и общение: Избр. тр. М., 1983.

### SUMMARY

*The conditions of the pre-school establishment teachers' formation of professional value orientations are demonstrated. The most distinguished of them are: individual style of activity, relations, active personal position of future teacher, his understanding of the multi-directedness and dialogue of the pedagogical process. The sense of concept "pedagogical conditions of professional value orientations formation" is disclosed.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 371.31

*А. У. Перавозны*

## МЕСЦА І ФУНКЦЫІ ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫІ Ў СУЧАСНАЙ ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

Месца дыферэнцыяцыі ў сучаснай школьнай адукацыі вызначаецца той роляй, якую яна адыгрывае ў пашырэнні разнастайнасці адукацыйных паслуг, ва ўдасканаленні вучэбнага працэсу, арыентацыі яго на асобаснае развіццё навучэнцаў. Гэтая роля становіцца асабліва зразумелай пры параўнанні цяперашняй сістэмы школьнай адукацыі з той, што існавала да сярэдзіны 80-х гг. Дыферэнцыяцыя закранула ўсе яе сферы, у выніку чаго ўзніклі новыя адукацыйныя структуры, адбыліся змены ў змесце адукацыі, яе арганізацыйна-педагагічным і працэсуальным аспектах.

Адзначым, што рух школьнай адукацыі па шляху дыфе-

рэнцыяцыі павінен мець пэўныя абмежаванні. Так, узмац ненне спецыялізацыі на трэцяй ступені школы можа прыве сці да страты універсальнасці сярэдняй адукацыі. У вынік навучэнцы пазбавяцца магчымасці змяніць напрамак сваё: адукацыі, паступаць у ВНУ, якая не адпавядае профілі атрыманай у школе падрыхтоўкі. Вось чаму так важна вы лучыць у змесце адукацыі інварыянтнае ядро, абавязкова для засваення ўсімі навучэнцамі.

Празмерная дыферэнцыяцыя ў класах з высокай напаў няльнасцю, якая выражаецца ў імкненні ўлічыць усе індыв дуальныя асаблівасці навучэнцаў, што робяць уплыў н якасць засваення імі прапануемага матэрыялу, пагража стратай кіруемасці вучэбным працэсам. Такая небяспечнасі павялічваецца, калі раскіданасць у ведах, уменнях і навыка навучэнцаў занадта вялікая. У сувязі з гэтым частка наста нікаў аддае перавагу працы ў класах з адносна аднародны саставам школьнікаў, навучанне якіх дыферэнцыруецi ў межах аднаго адукацыйнага ўзроўню.

Мы лічым, што дыферэнцыяцыю школьнай адукацыі тр ба разглядаць як складанаарганізаваную з'яву, што мае сваім саставе тры кампаненты: дыферэнцыяцыю агульнай с рэдняй адукацыі (прафілізацыю), унутрышкольную дыферэ цыяцыю, дыферэнцыраванае навучанне. Вызначым мес кожнага з кампанентаў у сістэме школьнай адукацыі.

Дыферэнцыяцыя агульнай сярэдняй адукацыі (прафілі цыя) праводзіцца на трэцяй ступені школы. Падрыхтоўка н вучэнцаў да профільнай адукацыі павінна ажыццяўляцца пачатковых класах і асабліва актыўна ў сярэднім звяне. Г неабходна для таго, каб на трэцяй ступені яны маглі вы чыць напрамак сваёй адукацыі ў адпаведнасці са здолы сцямі і жыццёвымі планамі. Калі вучань старэйшага кла не вызначыўся да гэтага часу са сваім прафесійным будучь ён можа займацца ў агульнаадукацыйныя класы, я павінны быць прадугледжаны ў структуры кожнай школы.

Асноўнай задачай профільнай адукацыі з'яўляецца п рыхтоўка школьнікаў да навучання ў ВНУ. Менавіта та профільныя прадметы, што ўключаюцца ў вучэбны пл павінны ахопліваць выбраную навучэнцамі галіну веда аб'ёме, дастатковым для паспяховага пераходу да атрыма адукацыі ў вышэйшай навучальнай установе; у іх выклад ні неабходна выкарыстоўваць прыёмы, што забяспечва развіццё творчай, даследчай накіраванасці асобы школьні

Унутрышкольная дыферэнцыяцыя стварае магчым для абуджэння і стымулявання пазнавальнай актыўн

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

школьнікаў, фарміравання іх агульных і спецыяльных здольнасцей, выяўлення схільнасцей, стварэння станоўчага стаўлення да навучання і школы ўвогуле. Яна павінна праводзіцца на ўсіх ступенях школы. Сярод форм унутрышкольнай дыферэнцыяцыі мы вылучаем тыя, што накіраваны на задавальненне павышаных пазнавальных патрэбнасцей навучэнцаў (факультатывы, спецсемінары, спецкурсы), і тыя, што забяспечваюць іх педагагічную падтрымку. Мэтазгоднасць ужывання той ці іншай формы вызначаецца ўзроставымі асаблівасцямі навучэнцаў, характарам іх пазнавальных патрэбнасцей, узроўнем падрыхтоўкі. Так, заняткі, што забяспечваюць педагагічную падтрымку вучняў, могуць праводзіцца на ўсіх ступенях школьнай адукацыі. У той жа час факультатывы, спецсемінары, спецкурсы дарэчы для работы са старэйшымі школьнікамі, класы перадпрофільнай падрыхтоўкі і факультатывы — у сярэднім звяне. Адзначым, што сістэма форм унутрышкольнай дыферэнцыяцыі адкрыта для ўключэння ў яе новых відаў работы са школьнікамі ўсіх узростаў.

Дзякуючы ўнутрышкольнай дыферэнцыяцыі ствараецца магчымасць для гарманізацыі запытаў вучняў і зместу адукацыі. Напрыклад, большасць прадметаў, якія ёсць у вучэбным плане сучаснай агульнаадукацыйнай школы, прадстаўляюць сабой выклад асноў навук. Гэта адмоўна адбіваецца на мастацкі адораных дзецях, падаўляе іх здольнасці, выклікае незадаволенасць ад навучання і школы ўвогуле. Ужыванне розных форм унутрышкольнай дыферэнцыяцыі можа садзейнічаць стварэнню спрыяльных умоў для развіцця школьнікаў, маючых мастацкія здольнасці.

Дыферэнцыраванае навучанне павінна ажыццяўляцца на ўсіх ступенях школы незалежна ад таго, які састаў навучэнцаў класа — аднародны ці разнародны па ўзроўню падрыхтоўкі. Адзначым, што крытэрыі дыферэнцыраванага навучання ў аднародных класах не залежаць ад таго, які менавіта ўзровень падрыхтоўкі маюць навучэнцы, Аднак тэмп навучання, ужываемыя прыёмы будуць мець істотныя адрозненні. У разнародных па ўзроўню падрыхтоўкі вучняў класах раскіданасць у ведах, уменнях і навыках можа быць настолькі вялікай, што настаўнік не здолее іх усе ўлічыць, а гэта адмоўна адаб'ецца на эфектыўнасці дыферэнцыраванага навучання. Гэткае ж становішча складваецца ў класах з высокай напаўняльнасцю, укамплектаваных навучэнцамі з рознымі інтарэсамі і здольнасцямі.

Менавіта ў такіх умовах рабіліся спробы ажыццявіць дыферэцыраванае навучанне на працягу некалькіх мінулых дзесяці-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

годдзяў. У шматлікіх школах так працягваецца і дагэтуль. Аднак адзначым, што калі ў былыя гады альтэрнатывы падобнаму шляху правядзення дыферэнцыраванага навучання не было, то сёння яна з'явілася. Арганізацыйныя перадумовы для эфектыўнага ажыццяўлення дыферэнцыраванага навучання ўзніклі дзякуючы прафілізацыі і ўнутрышкольнай дыферэнцыяцыі.

Вызначэнню *функцый* дыферэнцыяцыі сучаснай школьнай адукацыі садзейнічае высвятленне яе кампанентаў. Вызначым функцыі як дыферэнцыяцыі школьнай адукацыі ўвогуле, так і кожнага з трох яе кампанентаў.

Апрача спецыфічных функцый, аб якіх размова пойдзе далей, дыферэнцыяцыя выконвае функцыі агульнадыдактычныя: адукацыйную, развіццёвую, выхаваўчую. Іх ажыццяўленне павінна забяспечыць засваенне зместу адукацыі, развітасць мыслення і здольнасцей навучэнцаў, сфарміраванасць такіх асобасных якасцей, якія дазволяць вучню раскрыць свой патэнцыял, у прыватнасці працавітасці, зацікаўленасці ў набыцці новых ведаў і г. д. Усё гэта павінна актывізаваць сацыялізацыю асобы, павысіць прыстасавальнасць да жыцця ў сучасным грамадстве. Шляхі рэалізацыі агульнадыдактычных функцый дыферэнцыяцыі школьнай адукацыі вызначаюцца ўзроставымі ды індывідуальнымі асаблівасцямі навучэнцаў.

Да спецыфічных функцый дыферэнцыяцыі аднясём такія: пераўтваральную, арганізацыйную, пазнавальную, праектыўную.

Пераўтваральная функцыя вызначаецца ўкладам, які дыферэнцыяцыя ўносіць ва ўдасканаленне школьнай адукацыі. Дзякуючы дыферэнцыяцыі аказваецца рэальным пераадолець доўгія гады існаваўшую уніфікацыю адукацыйнай сістэмы, а таксама зместу і тэхналогій навучання. Будучы рэалізаванай на ўсіх ступенях школьнай адукацыі, ва ўсіх сваі кампанентах, дыферэнцыяцыя забяспечыць павышэнне яка сці падрыхтоўкі навучэнцаў, развіццё іх здольнасцей, мыс лення, станоўчых асобасных якасцей.

Сваю арганізацыйную функцыю дыферэнцыяцыя рэалізу ў той меры, у якой пад яе ўплывам перабудоўваецца работ канкрэтнай школы, усёй сістэмы агульнай адукацыі. Дзяку ючы дыферэнцыяцыі ў школе з'яўляюцца профільныя кла сы, павялічваецца колькасць факультатываў, праводзяц спецсемінары, спецкурсы, арганізуюцца групы (класы) педа гагічнай дапамогі і г. д. Дыферэнцыяцыя, такім чынам, ма сваім вынікам ускладненне арганізацыйна-педагагічнай мад лі школы. З уніфікаванай яна ператвараецца ў дыверсіфіка ваную, што прыводзіць да неабходнасці інтэнсіфікаваць рабо

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ту па ўпарадкаванню яе складнікаў і забеспячэнню нармальнага функцыянавання ўсёй навучальнай установы ўвогуле.

Ва ўмовах дыферэнцыяцыі павінна ўзрасці ўвага да кожнага школьніка. Гэтаму заклікана садзейнічаць яе пазнавальная функцыя. Яна заключаецца ў назапашванні і паглыбленні ведаў аб вучні, аб прыёмах, формах і сродках навучання, неабходных для стварэння аптымальных умоў для яго развіцця. Ад паўнаты ведаў аб узроставых, асобасных, прыродных асаблівасцях вучня залежыць ступень адэкватнасці педагагічных уздзеянняў яго ўнутраным магчымасцям.

З пазнавальнай, а таксама развіццёвай цесна звязана праектыўная функцыя дыферэнцыяцыі. Дзякуючы яе ажыццяўленню ўзнікае магчымасць прадугадаць траекторыю развіцця школьніка, загадзя стварыць адпаведныя ўмовы. Вялікае значэнне мае высвятленне прафесійнай накіраванасці асобы вучня з тым, каб своечасова прыняць меры для яе паўнацэннай рэалізацыі.

Кожны з кампанентаў дыферэнцыяцыі мае сваю, асобную функцыю. Так, функцыя дыферэнцыяцыі агульнай сярэдняй адукацыі заключаецца ў стварэнні навучэнцам магчымасці атрымаць спецыялізацыю ў той галіне ведаў, якая выклікае ў іх інтарэс. У сувязі з гэтым наменклатура профіляў павінна па магчымасці поўна адлюстроўваць будову сучасных ведаў.

Дзякуючы ўнутрышкольнай дыферэнцыяцыі ствараюцца арганізацыйныя перадумовы для аб'яднання навучэнцаў у аднародныя па якой-небудзь прыкмеце групы з мэтай іх навучання ва ўмовах больш спрыяльных у параўнанні з тымі, якія існуюць у разнародных класах (групах).

Функцыя дыферэнцыяцыі навучання заключаецца ў задавальненні пазнавальных патрэбнасцей навучэнцаў, ужыванні такіх прыёмаў, форм, сродкаў навучання, якія б дазволілі засвоіць змест адукацыі на ўзроўні, што адпавядае іх магчымасцям. Рэалізацыя гэтай функцыі — справа працаёмкая і не заўсёды  паспяховая, нават калі добра функцыянуюць іншыя кампаненты дыферэнцыяцыі. Такое становішча абумоўліваецца шэрагам праблем, разгляд якіх не з'яўляецца задачай дадзенага артыкула.


## SUMMARY

*When defining place and functions of differentiation of current school education author's approach to differentiation is used. In accordance with this approach differentiation has complex organization and consists of three components: differentiation of general secondary education ("profilization"), intraschool differentiation and differential instruction.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ